***С. А. Пацыенка** (Мінск),*
*аспірантка Беларускага дзяржаўнага універсытэта культуры*

# ВЫКАРЫСТАННЕ БЕЛАРУСКАЙ ЗАМКАВАЙ КУЛЬТУРЫ Ў ВУЧЭБНА-ВЫХАВАЎЧЫМ ПРАЦЭСЕ

На працягу многіх стагоддзяў нашы таленавітыя продкі абагачалі і папаўнялі скарбонку беларускай культуры. Няспынна вартуючы межы роднай зямлі ад ворагаў, яны клапаціліся і аб захаванні здабыткаў у культурнай сферы. Менавіта культурнае асяроддзе беларускіх замкаў стала яскравым таму пацвярджэннем.

Абарончыя збудаванні з'яўляюцца неад'емнай часткай беларускай культуры, сведкамі барацьбы народа за сваю свабоду і незалежнасць. Беларускія замкі, якія часткова яшчэ захаваліся, — сапраўды неацэнныя дакументы нашай гісторыі і нацыянальнай спадчыны.

Зварот да помнікаў беларускага замкавага дойлідства XIV—XVIII стагоддзяў павінен уяўляць сабой не простае вывучэнне спецыфікі і асаблівасцей беларускай архітэктуры адзначанага перыяду. Гэта — жывое пранікненне ў эпоху, непасрэдная сувязь навучэнца з культурна-гістарычнай спадчынай роднага краю. Вывучэнне замкавай культуры не павінна абмяжоўвацца вузкімі рамкамі архітэктуры. Замак — паняцце больш шырокае, чым проста помнік архітэктуры пэўнага стагоддзя. На жаль, у беларускай навуцы да гэтага часу замкі трактуюцца пераважна з пазіцый археалогіі, мастацтвазнаўства і г. д. (вывучэнне архітэктуры, выяўленчага мастацтва і да т. п.). Замкі разглядаюцца, ў першую чаргу, як фартэцыі, як кропкі дыслакацыі ваенных гарнізонаў. З гэтых пазіцый вывучаецца архітэктура саміх пабудоў — іх спецыфічныя функцыянальна-дэкаратыўныя элементы (байніцы, машыкулі, герсы і інш.), ландшафтнае размяшчэнне, сістэмы знешніх умацаванняў.

На наш погляд, такі спецыфічны феномен як беларуская замкавая культура варта разглядаць у больш шырокім культуралагічным аспекце. Вывучэнню замкавага побыту, ладу жыцця, асаблівага светаўспрымання, спецыфічнага адчування прасторы, псіхалагічнага адзінства насельніцтва замкаў з ландшафтам павінна надавацца адпаведная ўвага. Гісторыя, прапушчаная праз прызму культуры, дае магчымасць навучэнцам ацэньваць учынкі канкрэтных гістарычных дзеячаў, вынікі гістарычных падзей з больш аб'ектыўных пазіцый. Акрамя таго, яскравыя прыклады багатага гістарычнага мінулага, гераічнай барацьбы за абарону роднай зямлі садзейнічаюць фарміраванню паўнацэннай, нацыянальна-свядомай асобы, эстэтычнаму і патрыятычнаму выхаванню маладога пакалення.

Замкі з'яўляюцца яскравым сведчаннем як таленту і ўмення старажытных дойлідаў, так і прыкладам адвагі і доблесці нашых славутых продкаў. Менавіта пад сценамі магутных каменных волатаў адбывалася большасць крывавых бітваў, вынік якіх, часам, вырашаў лес усёй дзяржавы. Галоўныя вялікадзяржаўныя замкі былі рэзідэнцыямі вялікіх князёў, куды з'язджаліся паслы і прадстаўнікі ўлады амаль з усяго свету. У замках заключаліся перамір'і і аб'яўляліся войны.

У тыя неспакойныя часы, калі бяспека была вялікай прывілеяй, баявая гатоўнасць абарончых збуда-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ванняў нярэдка выратоўвала жыцці жыхароў цэлых паселішч. Таму клопату па ўтрыманні і своечасовым рамонце замкавых умацаванняў надавалася вельмі вялікая ўвага на дзяржаўным узроўні. Так, напрыклад, Статут 1588 года прадугледжваў разнастайныя "замкавыя" павіннасці для ўсіх жыхароў Вялікага княства Літоўскага, а здача замка ворагу лічылася дзяржаўнай здрадай: "хто бы теж замок наш неприятелю здрадою подал кроме причины голоду гвалтовного" "честь, горло и именья тратить"[1].

Нельга недаацэньваць ролю замкавага дойлідства ў беларускай гісторыі і культуры. Нездарма выдатны даследчык беларускай абарончай архітэктуры М. А. Ткачоў пісаў пра Беларусь часоў сярэдневечча як пра "краіну замкаў", дзе на адлегласці 30—40 км стаялі магутныя "астравы" абароны[2].

Першапачаткова (XIV—XV стст.) на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага з'явіліся замкі агульнадзяржаўнага прызначэння альбо вялікакняжацкія ці каралеўскія, гэта значыць замкі, якімі валодаў Вялікі князь. Будовы такога кшталту ўтрымліваліся за кошт вялікакняжацкай скарбніцы. У пакоях гэтых замкаў жыў сам "гаспадар" — Вялікі князь са сваім дваром — світай, чэляддзю, войскам. Агульнадзяржаўнымі былі, напрыклад, замкі ў Навагрудку, Гродне, Крэве.

Да пачатку XVI стагоддзя са знікненнем непасрэднай ваеннай пагрозы і ўзмацненнем эканамічнай магутнасці тутэйшых магнатаў дзяржаўныя замкі паступова згубілі сваё значэнне моцных абарончых цэнтраў і пачалі прыходзіць у заняпад[3]. З гэтага часу набыло шырокі размах будаўніцтва прыватнаўласніцкіх замкаў — рэзідэнцый буйных феадалаў. Так узніклі Мірскі замак Ільінічаў, Любчанскі замак Храптовічаў, Смалянскі замак Сангушкаў, Заслаўскі замак Глябовічаў і г. д.

У XVI стагоддзя замкавае будаўніцтва набыло якасна новую накіраванасць. Феадальныя замкі гэтай пары паступова страцілі аскетычныя рысы абарончых збудаванняў і ўсё больш пачалі адпавядаць не толькі ўтылітарна-ваенным мэтам, але і задачам прадстаўніцтва. Такім чынам, першапачаткова выконваючы чыста ўтылітарную функцыю абароны, замкі з цягам часу ператварыліся ў цудоўныя палацы. Замкавыя будовы, якія раней дэманстравалі моц і непрыступнасць краіны, пачалі ўхваляць яе багацце і веліч.

На жаль, з цягам часу старажытныя замкі — сведкі гераічнага мінулага нашага краю — пачалі прыходзіць у заняпад. Нязначныя рэстаўрацыйныя работы ўжо не маглі спыніць дзеяння няўмольнага часу. Каменныя муры беларускіх замкаў, якія вытрымлівалі шматлікія аблогі, войны, неаднаразова разбураліся і перабудоўваліся, сталі ахвярамі часу. Зараз на тэрыторыі Беларусі засталася вельмі нязначная колькасць адрэстаўраваных і прыдатных да наведвання замкаў. Усе ж астатнія, і такіх, дарэчы, большасць, ляжаць у руінах.

У наш час старажытныя замкі ўжо не маюць практычнага значэння. Аднак яны з'яўляюцца яскравым сведчаннем таленту і высокай культуры беларусаў далёкага мінулага, весткай нам, сённяшнім, ад нашых старажытных продкаў. Калі стаіш ля велічных руін Навагрудскага ці Крэўскага замкаў, нейкім дзіўным чынам адчуваеш няспынную сувязь стагоддзяў, што тонкай стужачкай звязвае наша імклівае XXI стагоддзе з неспакойнымі часамі Вялікага княства Літоўскага. Захаваць гэтую сувязь, данесці яе да нашых нашчадкаў, злучыць звёны мінулага і будучага — наша асноўная задача. Таму

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

далучэнне нашай моладзі да аховы архітэктурных помнікаў, узнаўлення спрадвечна беларускіх абрадаў і святаў у кантэксце сучаснасці робяць рэальнай узаемасувязь традыцый і навацый у беларускай культуры.

На сучасным этапе вельмі важна даць магчымасць маладому пакаленню, якое ахвотна цікавіцца гістарычным мінулым нашай краіны, рэалізаваць свае сілы на гэтай глебе. Невыпадкова, што надзвычай папулярным у апошні час стала правядзенне яркіх, відовішчных рыцарскіх турніраў, адкрыццё клубаў і майстэрань па адраджэнні беларускага гістарычнага адзення, зброі і г. д. Юнакі і дзяўчаты, якія ў вольны ад вучобы час займаюцца вывучэннем гісторыі і культуры роднага краю, маюць магчымасць з поспехам выкарыстоўваць самастойна атрыманыя веды ў адукацыйным працэсе, што, безумоўна, садзейнічае больш глыбокаму ўсведамленню вучэбнага матэрыялу, а таксама адыгрывае важную ролю ў працэсе фарміравання асобы.

Актуальным напрамкам у сучасным адукацыйным працэсе можа стаць правядзенне экскурсій па знакамітых мясцінах Беларусі. Непасрэднае далучэнне да аўтэнтычнага матэрыялу значна павышае эфектыўнасць адукацыйнага працэсу, а таксама мае на мэце пэўны аспект эстэтычнага і патрыятычнага выхавання маладога пакалення, светапогляд якога павінен быць навукова шырокім і фарміравацца на слаўных традыцыях беларускага народа, на трывалым грунце ўсёй яго шматвяковай гісторыі і культуры.

---

[1] Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Давед. Камент. // Беларус. Сав. Энцыкл.; Рэдкал.: І. П. Шамякін і інш. Мн., 1989. С. 488.

[2] *Ткачоў М. А.* Замкі Беларусі / Пад рэд. Ф. В. Барысевіча. Мн., 1977. С. 6.

[3] *Краўцэвіч А. К.* Гарады і замкі Беларускага Панямоння XIV—XVIII стст.: Планіроўка, культурны слой. Мн., 1991. С. 148—151.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***В. У. Сярдзюк*** *(Мінск),*
*аспірантка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры*

# ПАТРЫЯТЫЧНАЯ НАКІРАВАНАСЦЬ ХРАМАВЫХ СВЯТАЎ

У сучасным стане грамадства з усеагульнай касмапалітычнай накіраванасцю немалаважнай для захавання нацыянальнай самасвядомасці з'яўляецца катэгорыя патрыятызму. "Любоў да бацькаўшчыны праяўляецца ў прывязаннасці да ўсяго каштоўнага, свяшчэннага для душы — бацькоўскіх святынь і магіл продкаў"[1] — адзначаецца ў адным з праваслаўных часопісаў. Храмавыя святы (фэсты), перарастаючы рамкі набажэнства, набываюць грамадскі характар і становяцца святамі горада ці сяла. Шанаванне храмаў, святых сваёй зямлі, што праяўляецца ў фэстах, мае патрыятычны характар.

Хрысціянская храмавая традыцыя мае пачаткам яўрэйскае шанаванне іерусалімскага Храма, які быў духоўным цэнтрам і паломніцтва куды лічылася рэлігійным абавязкам.